# Там, дзе Гута была

***У гэтым годзе спаўняецца 60 год з дня вызвалення нашага раёна і пачатку вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адноўлена разбураная вайной гаспадарка, вырасла новае пакаленне людзей, якое не ведае жахаў вайны. Але не можа чалавечая памяць забыць былое, перажытае, і баліць сэрца аб родных мясцінах, аб той беластвольнай бярозцы, якую сам пасадзіў, аб рэчцы, дзе купаўся і загараў. Аднак не ўсе могуць вярнуцца да сваіх родных абшараў, бо няма вёскі, няма ўжо і жыхароў, іх раскідала вайна.***

***Некалі ў раёне была вёска Гута, якую захопнікі спалілі. Нягледзячы на намаганні застаўшыхся ўжывых, аднавіць яе, на жаль, не ўдалося. Многа год назад жыхары "раскіданага гнязда'' ставілі перад уладамі пытанне аб увекавечанні памяці гэтай вёскі. Тады "на Гуце" быў устаноўлен помнік загінуўшым. Сёння ёсць магчымасць надрукаваць гісторыю вёскі Гута, бо яна сабрана па кропельках ад тых, хто жывы і ў сваім сэрцы нясе нявыказаны боль аб велізарнай страце — страце сваёй малой радзімы***.

Здаўна людзі, што жылі ў нашым краі, займаліся металургіяй, выраблялі шкло, што знаходзіць падцверджанне ў шырокім распаўсюджанні назваў Гута на Беларусі. Слова Гута вучоныя выводзяць ад нямецкага Huute, якое мае два значэнні — металургічны завод і шкла_робны завод. У апошнім значэнні гэта слова ўжываецца і ў польскай мове. Архіўныя матэрыялы сведчаць аб існаванні на тэрыторыі Хоцімшчыны ў 18–19 стагоддзях шклянога завода ля вёскі Батаева. Як і ўсе прадпрыемствы таго часу, шкляны завод быў невялікі. Тут працавалі 11 рабочых, якія выраблялі шкло, бутэлькі, штофы, шклянкі, чаркі, у тым ліку і паўкрыштальныя.

У 1861 годзе, пасля адмены прыгоннага права, гаспадаром зямель, на якіх знаходзілася Гута, стаў памешчык Шчэглавіты. Шклозавод к таму часу сваю дзейнасць спыніў, і на яго месцы засталіся толькі падсобныя збудовы. Ворныя землі, лугі і лес у арэнду ў Шчэглавітага браў арандатар Евель. У перыяд першай сусветнай вайны ў хлявах, што засталіся на шклозаводзе, жылі ваеннапалонныя аўстрыйскія салдаты, якія працавалі на лесапавале, дзе нарыхтоўвалася драўніна для піларамы, што працавала на Міхаліне.

У перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі ўсе забудовы шклозавода былі спалены.

У 1920 годзе на Гуту з вёсі Дубраўка першым перасяліўся беззямельны селянін Лаўроў Харытон Максімавіч з сям'ёй. Так пачала будавацца вёска, якую ўсе называлі Гута. Праз некаторы час у вёсцы было ўжо 17 двароў. У склад вёскі ўваходзіў і хутар Камянец, які складаўся з трох двароў. У1932 годзе на Гуце быў арганізаваны калгас, які на звалі "Чырвоная Гута". У гэты час у вёсцы пражывала каля 70 чалавек. Першым у калгас уступі Піліпенка Дзмітрый Карпавіч. Старшынёй калгаса быў абраны Рафеенка Раман Ільіч. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў калгасе было ўжо каля 100 кароў, 25 коней, больш за 200 авечак. Пасля аб'яўлення вайны коней забралі ў войска, а кароў і авечак дзяўчаты Лаўрова Паліна, Лаўрова Кацярына, Піліпенка Марыя і Піліпенка Дуня пагналі аж у Тамбоў. Пайшлі служыць у войска і 11 мужчын з вёскі Гута.

З першыхдзён нямецкай акупацыі раёна ў лясах, што акружаюць Гуту, сталі збірацца не выйшаўшыя з акружэння салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі. Яны стварылі партызанскія групы і атрады, якія пасля ўліліся ў састаў Клятнянскай брыгады.

У Гуту часта заходзілі партызаны з брыгады А.Ф. Фёдарава, атрадаў Шамякіна, Галюгіна і іншых. У вёсцы для партызан выпякалі хлеб, назапашвалі іншую правізію. Усё гэта вельмі непакоіла захопнікаў, і ў сакавіку 1942 года яны прачосваюць лес вакол Гуты, а ў жыхароў вёскі забіраюць кароў і схаванае зерне.

14 сакавіка ў двары Лаўровай Афанассі карнікі расстралялі двух партызан, якіх захапілі ў вёсцы ў стане цяжкага абмаражэння. Гэта былі Якубоўскі Сцяпан і Сабакін Мікалай.

У пачатку ліпеня 1943 немцы, зняўшы франтавыя часці, пачалі ачыстку прыфрантавой паласы ад партызан. 6 ліпеня недалёка ад вёскі Гута партызаны арганізавалі засаду, дзе знайшлі сваю пагібель шмат карнікаў. Ноч карнікі правялі ў вёсцы Гута. Раніцай 7 ліпеня яны пайшлі з вёскі, каб арганізаваць засаду на партызан, але апошнія разгадалі задумкі немцаў і адступілі далей ў лясны масіў. Раззлаваўшыся на няўдачу, карнікі вярнуліся ў вёску, сагналі ўсіх жыхароў на калгасны двор, а вёску запалілі. Замініраваўшы падыходы, яны пакінулі пылаючую вёску, а ўсіх жыхароў пагналі з сабой як жывы шчыт. Толькі праз два тыдні жыхары Гуты змаглі вярнуцца на папялішча.

26 верасня 1943 года Хоцімскі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У дзеючую армію былі прызваны 6 жыхароў вёскі Гута 1926-27 гадоў нараджэння.

Зіму сустрэлі гутляне ў вёсцы Дубраўка, дзе жылі па 3-4 сям'і ў адной хаце. У канцы сакавіка 1944 года на Гуце былі пабудаваны тры зямлянкі, і зноў, як і ў 1920 годзе, першым да родных абшараў прыехаў Лаўроў Харытон Максімавіч. Паступова пачалі будавацца невялікія хаты. Усяго іх пабудавалі 10 сем'яў, аднак пасляваеннае адраджэнне Гуты не набрала сілы, і жыццё ў ёй паступова згасла. Апошнія жыхары пакінулі вёску ў 1969 годзе.

Няма вёскі, толькі некалькі яблынь на месцы былых садоў ды помнік Якубоўскаму і Сабакіну стаяць на полі сярод лесу. Колькі б ні прайшло гадоў пасля той ліпеньскай раніцы 1943 года, боль аб роднай вёсцы, якая была знішчана, яшчэ не пакінула сэрцы тых нямногіх гутлян, якіх жыццё раскідала па розных кутках некалі, вялікай краіны. Вясной зноў зацвітуць яблыні, заквітнеюць лугі, прыляцяць птушкі, але не зазвіняць дзіцячыя галасы там, дзе Гута была.

**Віктар КРЫВІЦКІ,**
**сапраўдны член Беларускага**
**геаграфічнага таварыства,**
**настаўнік геаграфіі вышэйшай катэгорыі**
*(Матэрыял запісан са слоў*
*былога жыхара в. Гута Лаўрова)*

**Крывіцкі, В. Там, дзе Гута была** : [аб вёске Гута Хоцімскага раёна] / Віктар Крывіцкі // Шлях Кастрычніка. — 2003. — 8 мая. — С. 2.